Здаўна беларусы ўпрыгожвалі сваё жытло разьбой па дрэву, рабілі ліштвы, ганачкі. Бедны народ не мог купляць сабе дарагія рэчы і таму ўсё неабходнае вырабляў сабе з дрэва, з лазы, з бяросты. Беларускіх разьбяроў па дрэву запрашаў рускі цар у XVII стагоддзі працаваць у Маскве і Падмаскоўі, упрыгожваць разьбой іканастасы сабораў і інтэр'еры палацаў. Аб высокім прафесійным узроўні сведчаць помнікі XVII – XVIII стагоддзяў.

Работы мастакоў па дрэву вельмі разанстайныя. Гэта і дэкаратыўнае панно, выкананыя ў рознай тэхніцы разьбы, аб'ёмна-рэльефнай і навылётнай. Скульптурныя работы ахопліваюць усе тэмы і жанры мастацтва: бытавы і гістарычны жанр, партрэт, свет казачных вобразаў і акружаючую паўсядзённасць.